# Тэматычныя дамінанты дыскурсу гістарычнай памяці ў беларускай прэсе

УДК 81'42(045)



**Ганна БІЮМЕНА,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

Ганна БІЮМЕНА. Тэматычныя дамінанты дыскурсу гістарычнай памяці ў беларускай прэсе. У артыкуле абгрунтавана паняцце дыскурсу гістарычнай памяці ў прэсе, выдзелены тэматычныя дамінанты публікацый, прысвечаных захаванню памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, вызначаны моўныя сродкі іх эксплікацыі ў матэрыялах беларускіх друкаваных выданняў. Падкрэсліваецца высокі каштоўнасны патэнцыял медыядыскурсу гістарычнай памяці, а таксама яго роля ў выхаванні патрыятызму, фарміраванні этнічнай і культурнай ідэнтычнасці, развіцці маральных арыенціраў асобы і салідарызацыі грамадства.
Ключавыя словы: медыядыскурс, прэса, гістарычная памяць, дыскурс гістарычнай памяці, Вялікая Айчынная вайна.

Anna BIYUMENA. Dominating themes in the historical memory discourse in the Belarusian press. The article substantiates the concept of historical memory discourse in the print press, highlights dominating themes of the publications devoted to the preservation of the memory of the Great Patriotic War, defines the language means of their explication in the Belarusian print media. The author highlights high value potential of historical memory media discourse and its importance for cultivating patriotism, forging ethnic and cultural identity, building a moral compass in an individual and promoting the solidarity of society.
Keywords: media discourse, press, historical memory, discourse of historical memory, Great Patriotic War.

У сучасным свеце, які характарызуецца плюралізмам меркаванняў, множнасцю каналаў перадачы паведамленняў і перагружанасцю інфармацыйнай прасторы, захаванне гістарычнай памяці ўяўляе адну з найважнейшых задач, якую трэба вырашаць на дзяржаўным узроўні. У Беларусі, як вядома, 2022 год абвешчаны Годам гістарычнай памяці.

Феномен гістарычнай памяці шырока вывучаецца прадстаўнікамі розных гуманітарных навук: гісторыкамі, філосафамі, сацыёлагамі, палітолагамі, псіхолагамі. Такую памяць разглядаюць як «сукупнасць данавуковых, навуковых, квазінавуковых і пазанавуковых ведаў і масавых уяўленняў соцыуму аб агульным мінулым» *[1, с. 133]*. Гістарычная памяць як сацыякультурна абумоўленая з'ява, дэтэрмінаваная гістарычным шляхам канкрэтнага народа, уяўляе важную культурную і маральную катэгорыю *[2; 3]*.

Традыцыйна гістарычную памяць падзяляюць на індывідуальную і калектыўную (сямейную, радавую, гарадскую, нацыянальную і інш.) *[4]*. Калектыўная гістарычная памяць як вопыт мноства індывідаў адлюстроўвае сацыяльную рэальнасць, дэманструе цесную сувязь з тымі ці іншымі сацыяльнымі групамі, мае ярка выражаны сімвалічны характар, што дазваляе ёй служыць асновай нацыянальнай і грамадзянскай ідэнтычнасці *[4]*.

Вобразы і падзеі, якія з'яўляюцца зместам гістарычнай памяці, заўсёды выбарачныя і эмацыйна афарбаваныя. Гэта перш за ўсё «найбольш значныя, эпахальныя падзеі, якія маюць магутны грамадскі рэзананс і з прычыны гэтага выклікаюць у людзей моцны эмацыйны водгук» *[5, с. 79]*.

## ПРА АЎТАРА

БІЮМЕНА Ганна Аляксандраўна.

Нарадзілася ў г. Крычаве Магілёўскай вобласці. Скончыла Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (МДЛУ) у 2001 годзе, аспірантуру гэтай ВНУ (2007). З 2019 года – дактарант кафедры маўленнезнаўства і тэорыі камунікацыі МДЛУ.

З 2001 года працуе ў МДЛУ. З 2019 года – дацэнт кафедры маўленнезнаўства і тэорыі камунікацыі МДЛУ.

Кандыдат філалагічных навук (2010), дацэнт (2016).

Аўтар больш за 130 навуковых прац, дзвюх манаграфій, трох навучальных дапаможнікаў.

Сфера навуковых інтарэсаў: семантыка, прагматыка, медыялінгвістыка.



**У сярэдзіне чэрвеня ў Мінску прайшла Міжнародная парламенцкая канферэнцыя «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам». На здымку: падчас працы секцыі «Вялікая Перамога ў грамадска-медыйным дыскурсе» ў храме-помніку ў гонар Усіх Святых. 2022 год**

Безумоўна, адной з такіх падзей, якія вызначылі развіццё беларускага народа і дзяржавы, з’яўляецца перамога ў Вялікай Айчыннай вайне. Значнасць яе для сучасных беларусаў пацвярджаецца і вынікамі сацыялагічных апытанняў. Так, падчас маштабнага рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання, праведзенага Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў 2014 годзе, 68,2 % апытаных жыхароў Беларусі назвалі яе найбольш важнай падзеяй у гістарычнай эвалюцыі беларускага грамадства *[6, с. 55]*.

На думку Т.У. Падаляк, Вялікая Айчынная вайна мае для Беларусі экзістэнцыйнае значэнне: яна была тым стратэгічным выклікам, які паставіў пад сумненне само існаванне беларускага этнасу *[7, с. 77]*. Як падкрэслівае І.А. Валахановіч, падзеі Другой сусветнай вайны «далі штуршок дзяржаўна-нацыянальнаму параўладкаванню Беларусі, спрыялі згуртаванню беларускай нацыі ў межах аднаго дзяржаўнага аб’яднання. У гады вайны была даказана здольнасць беларускай нацыі да выбару прыярытэтаў у рамках агульнасусветных каштоўнасцей (рэальнае супраціўленне агрэсіі, асуджэнне калабарацыянізму і ваенных злачынстваў)» *[8, с. 72]*. Таму немагчыма пераацаніць яе ролю як аксіялагічнага індыкатара і своеасаблівай «гістарычнай падсветкі» сучаснасці *[7, с. 112]*.

Функцыі захавання і перадачы гістарычнай памяці ажыццяўляюць сямейны міжпакаленчы дыскурс, розныя сацыяльныя інстытуты, сярод якіх вылучаюцца сістэма адукацыі і, вядома, сродкі масавай камунікацыі. Вынікі кантэнт-аналізу сучаснай беларускай прэсы пацвярджаюць выказаныя вышэй думкі аб важным месцы Вялікай Айчыннай вайны ў прасторы калектыўнай гістарычнай памяці Беларусі, паколькі пераважная большасць публікацый на гістарычную тэматыку прысвечана менавіта гэтай падзеі.

Мэта даследавання заключаецца ў вызначэнні тэматычных дамінант у дыскурсе гістарычнай памяці беларускіх друкаваных выданняў, прысвечаных захаванню памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. Мы лічым мэтазгодным выдзяленне паняцця «дыскурс гістарычнай памяці» на падставе тэматычнага крытэрыя як аднаго з магчымых параметраў тыпалагізацыі дыскурсіўных практык (пар., напрыклад, дыскурс Пецярбурга, дыскурс пра каханне) *[9]*. Матэрыял даследавання склалі 150 артыкулаў, апублікаваных на афіцыйных парталах рэспубліканскіх і рэгіянальных газет у 2018–2022 гадах («СБ. Беларусь сегодня», «Народная газета», «Сельская газета», «Знамя юности», «Рэспубліка», «Союз. Беларусь-Россия», «Светлае жыццё» (Лельчыцы), «Зара над Нёманам» (Масты), «Пінскі веснік», «Кричевская жизнь», «Міёрскія навіны», «Веснік Глыбоччыны», «Асіповіцкі край» і інш.).

У выніку аналізу былі вылучаны наступныя тэмы, да якіх рэгулярна звяртаюцца журналісты пры асвятленні вызначанай тэматыкі.

**Важнасць асабістых гісторый для ўсведамлення ўплыву Вялікай Айчыннай вайны на развіццё Беларусі.** Газеты часта публікуюць успаміны людзей пра розныя ваенныя падзеі. Пры гэтым крыніцамі такога матэрыялу могуць быць як самі ветэраны, так і іх нашчадкі, работнікі музеяў і г. д. Усе падобныя наратывы ў матэрыяле даследавання характарызуюцца павышанай эмацыйнасцю, што адлюстроўваецца ў вялікай колькасці эмацыйна афарбаванай лексікі і слоў, якія называюць пераважна негатыўныя эмоцыі (трывога, адчай, страх, страшэнны, жах, жудасны): *Жуткие преступления захватчиков были зафиксированы* («Рэспубліка», 2022, 25 студз.); *Общие боль и память* («Асіповіцкі край», 2022, 25 студз.); *Война окунула ее в пыль долгих дорог, поселила в совсем еще детской душе боль и отчаяние, отпечатала ужас голода и ранений* («Народная газета», 2022, 8 студз.); *Тревога поселилась в наших сердцах* («Зара над Нёманам», 2022, 27 студз.).

Паўтарэнне гэтых лексем на працягу публікацыі стварае спецыфічны прагматычны эфект «апускання» ў страшныя падзеі, перажывання іх разам з героем матэрыялу. Напрыклад, у артыкуле, які змяшчае аповед жыхара адной з беларускіх вёсак Мікалая Чыжыка пра знішчэнне фашыстамі ўсёй яго сям'і, тры разы выкарыстоўваецца назоўнік *жах* і адзін – аднакаранёвы яму прыметнік *жахлівы*, што передае атмасферу перажытага дзіцём бясконцага жаху: *І самыя жахлівыя – Мікалая Чыжыка; Я рвануў дамоў, а тут такое… Проста жах!; Жах, які працягваўся некалькі хвілін, нават уявіць сабе цяжка; Тады я анямеў і аслупянеў ад жаху* («Сельская газета», 2022, 11 студз.).

Апавяданні жыхароў Беларусі пра карныя аперацыі фашыстаў таксама змяшчаюць шмат лексічных адзінак з семантыкай смерці і знішчэння (зверстваваць, забіць, спаліць, гарэць, расстраляць, падстрэліць, смерць): *Мужчина пытался скрыться, но его подстрелили на бегу* («Пінскі веснік», 2022, 27 студз.); *А мой тата нехадзячы быў і вынесці яго не далі – згарэў ён у агні жыўём на нашых з мамай вачах* («Веснік Глыбоччыны», 2020, 3 ліп.).

Такім чынам, інтэрсуб'ектнае шматгалоссе, паліфанічнае гучанне розных галасоў, якія расказваюць асабістыя гісторыі пра вайну, ствараюць атмасферу даверлівасці, пацвярджаюць дакладнасць ваенных падзей, прымушаюць чытача суперажываць героям публікацый.

Гісторыі пра вайну часта расказваюць нашчадкі яе ўдзельнікаў. Адзначым маркіраваную аксіялагічнасць такіх матэрыялаў, таму што расказчыкі падкрэсліваюць высокі каштоўнасны патэнцыял гэтых апавяданняў для гісторыі сям'і, для сямейнай гістарычнай памяці: *Горжусь тем, что мои родные, как и миллионы людей, внесли свой вклад в Великую Победу … Бережно храню эту героическую, в чем-то даже мистическую историю. Дедушка научил меня любить и ценить каждый прожитый день, дорожить родными* («Народная газета», 2022, 16 студз.).

Акрамя таго, у прэсе сустракаюцца напісаныя журналістамі біяграфічныя нарысы пра герояў вайны. У іх ідзе гаворка пра подзвігі і мужныя ўчынкі герояў, што падкрэсліваецца лексікай з адпаведнай семантыкай (герой, гераічны, адважны, подзвіг, мужнасць, адвага): *Подвиг 20-летнего пулеметчика Сильницкого из партизанского отряда под командованием Даниила Райцева был совершен весной 1942-го, когда сопротивление гитлеровцам на белорусских землях только разворачивалось. Листовки и другие информационные материалы о погибшем герое активно распространялись в оккупированных нацистами районах Беларуси, его пример вдохновлял молодежь, только собиравшуюся уйти в лес; В изданной в 1964 году книге второго секретаря ЦК КП(б)Б, известного организатора партизанского движения Петра Калинина читаем: «Отважный, скромный, молчаливый, но всегда готовый выручить товарища – таким знали партизаны Мишу Сильницкого»* («Союз. Беларусь-Россия», 2021, 9 снеж.).

Разам з тым, персанажы артыкулаў паказаны як звычайныя людзі, што падкрэслівае іх блізкасць да чытацкай аўдыторыі: *При этом биографических фактов о самом Михаиле до сих пор известно немного – впрочем, их и не могло быть в избытке у росшего на самом берегу Западной Двины простого сельского парня, сына деревенского кузнеца Федора Ивановича Сильницкого; По словам матери, с первенцем семье Сильницких пришлось совсем непросто – то на крышу залезет, то на березу, то на плоты на Двине убежит, а то и в реку сиганет, рано научившись плавать. Изрядно проказничал будущий герой и в школе, где его особо привлекал кружок Осоавиахима, в котором были стрельба из малокалиберной винтовки и лыжи* («Союз. Беларусь-Россия», 2021, 9 снеж.).

Яшчэ адна тэма, да якой звяртаюцца журналісты пры асвятленні падзей Вялікай Айчыннай вайны, – **важнасць сувязі пакаленняў для захавання гістарычнай памяці**. Адной з вядучых функцый гістарычнай памяці з'яўляецца трансляцыя ўніверсальных і нацыянальных каштоўнасцей з дапамогай перадачы сацыяльна-гістарычнага вопыту новым пакаленням. Гістарычная памяць заўсёды суадносіцца з воссю «мінулае – сучаснасць – будучыня»: яна «фарміруецца ў непасрэднай сувязі з існуючай сацыяльнай сітуацыяй, вызначае стаўленне цяперашніх пакаленняў да гістарычнага мінулага народа, краіны і дзяржавы, адлюстроўвае іх ацэнкі мінулага і з'яўляецца асновай для фарміравання адносін да будучыні» *[5, с. 80]*.

У публікацыях прэсы падкрэсліваецца цікавасць дзяцей і моладзі да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, яе значнасць пры перадачы гістарычнай спадчыны і высокі аксіялагічны патэнцыял у выхаваўчым і адукацыйным працэсе. Гэтыя ідэі акцэнтуюцца пры дапамозе метафар, пазітыўнаацэначнай лексікі, слоў, якія называюць станоўчыя эмоцыі (гонар, цікавасць): *Меня очень интересует и притягивает тема войны, особенно то, что напоминает нам о Великой Победе. Я считаю, что именно такие акции являются тем самым мостом между прошлым и будущим, а принимать в них участие интересно молодому поколению* («Веснік Глыбоччыны», 2020, 27 мая); *Брать детей в экспедиции, на живых примерах воспитывать в них чувство гордости за предков-героев, растить себе достойную смену – одна из задач «Виккру»* («Рэспубліка», 2022, 13 студз.). Наступная тэма – **значнасць пэўных месцаў і аб'ектаў для захавання гістарычнай памяці.** У ролі топасаў калектыўнай гістарычнай памяці могуць выступаць разнастайныя культурныя формы гарадскога ландшафту – музеі, помнікі, мемарыяльныя комплексы, мемарыяльныя знакі і таблічкі і інш.: *По рекомендации Николая Борисенко на Буйничском поле, увековеченном Симоновым, появился памятный валун, впоследствии – каплица. А в могилевском микрорайоне Казимировка за счет «Виккру» установили таблички с надписью: «На этом месте в годы войны фашисты уничтожали мирных жителей – стариков, женщин, детей»* («Рэспубліка», 2022, 13 студз.); *В каждом городе и местечке остались братские захоронения. На местах массовых расстрелов теперь стоят памятники. К ним возлагают цветы. Здесь зажигают поминальные свечи* («Пінскі веснік», 2022, 27 студз.); *У мемориального знака узникам Брестского гетто прошел митинг-реквием, посвященный памяти жертв Холокоста* («СБ. Беларусь сегодня», 2022, 27 студз.).

Асобнае месца ў калектыўнай гістарычнай памяці беларускага народа займае Брэсцкая крэпасць, абаронцы якой першымі ў нашай краіне прынялі на сябе ўдар фашыстаў. Цяпер яна мае статус мемарыяльнага комплексу і аднаго з найважнейшых турыстычных аб'ектаў Беларусі, што адлюстроўваецца ў шматлікіх публікацыях прэсы: *Брестская крепость не только сохраняет историческую память, но и дает возможность воспитывать чувство патриотизма у подрастающего поколения* («Союз. Беларусь-Россия», 2021, 23 снеж.); *Зимой и летом, в стужу и зной у Вечного огня мемориального комплекса «Брестская крепость-герой» стоят часовые* («Знамя юности», 2022, 20 студз.).

І яшчэ адна вызначаная намі тэма – **захаванне гістарычнай памяці як дзейнасць**. Гістарычная памяць – гэта асаблівая сукупнасць ведаў і ўяўленняў аб мінулым, якая абавязкова павінна быць увасоблена на практыцы *[10, с. 47]*. Для захавання гістарычнай памяці пра Вялікую Айчынную вайну і яе герояў у нашай краіне праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы, разлічаныя на самыя розныя сацыяльныя групы (мітынгі, шэсці, ускладанне вянкоў і кветак, семінары, экскурсіі, прэзентацыі, выставы, аўта- і велапрабегі і інш.): *В школах будут проходить уроки мужества, дни воинской*



22 чэрвеня 2022 года ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» адкрылася выстава «Лёсы, складзеныя ў трохкутнік». Гэта сумесны праект Беларускага тэлеграфнага агенцтва і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

*славы, встречи с ветеранами. Для детей организуют тематические экскурсии в музеи и воинские части, просмотр тематических фильмов, квест-игры, спартакиады* («Народная газета», 2022, 16 студз.); *Кстати, к этой дате в читальном зале подготовлена и тематическая выставка «Холокост: в сердце и памяти навечно», где представлены материалы о Холокосте в Беларуси, Кричевском лагере военнопленных* («Кричевская жизнь», 2022, 28 студз.); *В актовом зале городской центральной библиотеки активисты городской организации ОО «Белорусский союз офицеров» организовали семинар-практикум, посвященный увековечению памяти жителей Пинщины, защитивших наше Отечество в годы Великой Отечественной войны* («Пінскі веснік», 2022, 19 студз.).

Каб зацікавіць гістарычнай тэматыкай дзіцячую і маладзёжную аўдыторыю, выбіраюцца новыя фарматы дзейнасці: *Злата Кулаковская – самая юная среди глубочан участница челленджа #75песеновойне* («Веснік Глыбоччыны», 2020, 27 мая); *22 января в 3-м классе Тонежского детского сада – базовой школы прошла литературно-музыкальная композиция «Верните память», посвященная 78-й годовщине освобождения Лельчицкого района от немецко-фашистских захватчиков* («Светлае жыццё», 2022, 24 студз.).

Такім чынам, у ролі тэматычных дамінант публікацый беларускай прэсы аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны выступаюць асабістыя гісторыі і перажыванні яе ўдзельнікаў, сувязь паміж пакаленнямі, сувязь калектыўнай памяці з пэўнымі месцамі і аб'ектамі, разнастайныя віды дзейнасці па яе захаванні. Гістарычная памяць адыгрывае важную ролю ў выхаванні патрыятызму, фарміраванні этнічнай і культурнай ідэнтычнасці, выпрацоўцы каштоўнасных арыенціраў асобы. Дыскурс гістарычнай памяці ў прэсе накіраваны на салідарызацыю грамадства, аб'яднанне людзей на аснове ўсведамлення дачынення да сумеснага гераічнага мінулага і гонару за сваю краіну.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 25.02.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Репина, Л.П. Концепция социальной и культурной памяти в современной историографии / Л.П. Репина // Феномен прошлого / отв. ред. И.М. Савельева, А.В. Полетаев. – М., 2005. – С. 122–170.
2. Коваленя, А. К вопросу об исторической политике / А. Коваленя, В. Арчаков, В. Данилович, А. Баньковский // Беларуская думка. – 2019. – № 8 – С. 3–11.
3. Винокурова, С.П. Социокультурный статус исторической памяти / С.П. Винокурова // Историческая память о Беларуси как фактор консолидации общества: материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 26–27 сент. 2019 г. / редкол.: Г.П. Коршунов (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2019. – С. 8–10.
4. Ростовская, О.М. Историческая память как объект социально-философского исследования: дис. … канд. филос. наук: 09.00.11 / О.М. Ростовская. – Минск, 2019. – 125 л.
5. Мысливец, Н.Л. Историческая память: особенности формирования и основное содержание / Н.Л. Мысливец // Весн. Гродзенс. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Сер. 3. Эканоміка. Сацыялогія. Біялогія. – 2018. – Т. 8, № 1. – С. 77–83.
6. Малмыгин, А.С. Социальное событие как фактор формирования исторической памяти / А.С. Малмыгин // Историческая память о Беларуси как фактор консолидации общества: материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 26–27 сент. 2019 г. / редкол.: Коршунов Г.П. (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2019. – С 55–56.
7. Падаляк, Т. У. Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі / Т.У. Падаляк. – Мінск: БДУ, 2016. – 263 с.
8. Валаханович, И.А. Вторая мировая война в исторической политике Беларуси / И.А. Валаханович // Безопасность: новые грани и резервы: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 10–11 дек. 2020 г.: в 5 т. / Ин-т нац. безопасности Республики Беларусь; редкол.: Г.Г. Краско (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2021. – Т. 1. – С. 68–73.
9. Киров, Е.Ф. Текст и дискурс в семиотическом соотношении / Е.Ф. Киров // Вест. Волградс. гос. ун-та. Сер. 2, Языкознание. – 2018. – Т. 17, № 2. – С. 15–25.
10. Линченко, А.А. Праксиологическое понимание ценностей исторической памяти / А.А. Линченко // Историческая память о Беларуси как фактор консолидации общества: материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 26–27 сент. 2019 г. / НАН Беларуси, Ин-т социологии НАН Беларуси; редкол.: Г.П. Коршунов (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2019. – С. 47–49.